танняў. З гэтай мэтай павінны атрымаць самае шырокае выкарыстанне актыўныя метады навучання.

Казлоўская Ю.П.,
выкладчык

## АКТЫВІЗАЦЫЯ ПАЗНАВАЛЬНЫХ ПРАЦЭСАЎ ЯК ФАКТАР ФАРМІРАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ
(на матэрыяле курса «Сацыяльная псіхалогія»)

Адна з найбольш важных задач, якія вырашае сення вышэйшая школа, - гэта ўсебаковае развіцце кожнага студэнта, развіццё яго ведаў, уменняў, навыкаў, інтуіцыі і здольнасцей.

Кожны чалавек ад нараджэння надзелены задаткамі, якія неабходны для дзейнасці і зносін з навакольным яго светам. Аднак магчымасці фарміруюцца ў чалавека толькі шляхам авалодання грамадскім вопытам у працэсе зносін, а таксама ў працэсах навучання і выхавання. Калі мы гаворым аб авалоданні студэнтамі ведамі, уменнямі, навыкамі, фарміраванні ў іх інтуіцыі і развіцці здольнасцей, неабходна адзначыць у гэтым ролю пазнавальных працэсаў, менавіта памяці, уяўлення, мыслення, мовы, успрымання і адчуванняў. Гэтыя псіхічныя працэсы - ядро асобы чалавека, ад іх развіцця залежыць, якім і кім можа стаць чалавек у жыцці.

Напісана шмат работ па вывучэнню агульных і спецыяльных здольнасцей: музычныя здольнасці (А.Кавалеў, В.Ягункова), выяўленчыя здольнасці (Ф.Ганабалін, Н.Кузьміна), арганізатарскія здольнасці (Л.Уманскі), агульныя разумовыя здольнасці (Н.Лейтэс). У гэтых работах знаходзім адказы на пытанні, што такое здольнасці, якая іх структура, як яны фарміруюцца і развіваюцца.

У сучасных методыках і дапаможніках прапануюцца заданні, базай якіх з'яўляецца выкарыстанне непраграмнага займальнага матэрыялу. Галоўная задача выкладчыка вышэйшай навучальнай установы - развіццё здольнасцей студэнта непасрэдна ва ўмовах дыферэнцыраванага навучання, менавіта на лекцыях, семінарскіх і практычных занятках (у нашым выпадку па сацыяльнай псіхалогіі), ужыванне пры гэтым як дадатковага , так і абавязковага праграмнага матэрыялу.

Мы паспрабавалі скласці канкрэтныя практыкаванні па развіццю памяці, мыслення на базе праграмнага матэрыялу па курсу «Сацыяльная псіхалогія».

Выкладчык, выкарыстоўваючы блок гэтых практыкаванняў, можа скласці розныя камбінацыі ў залежнасці ад мэт і задач, якія ён збіраецца рашаць на лекцыях, семінарскіх і практычных занятках па курсу «Сацыяльная псіхалогія». На заліках выкладчык можа выкарыстоўваць увесь блок практыкаванняў для кантролю ведаў, уменняў, навыкаў студэнтаў. Кожнае з практыкаванняў, прапанаванае намі па курсу «Сацыяльная псіхалогія», мае сваю мэту. Так, адны практыкаванні дапамогуць выкладчыку развіць у студэнтаў здольнасці фарміраваць паняцці, складаць суджэнні, рабіць правільныя вывады; другія накіраваны на тое, каб развіваць у студэнтаў аперацыйныя кампаненты мыслення: аналіз, сінтэз, параўнанне, абстрагаванне, абагульненне; трэція дапамогуць выкладчыку развіць асэнсаванае запамінанне матэрыялу студэнтамі. Задача выкладчыка - развіваць усе віды памяці (зрокавую, слыхавую, рухальную, слоўналагічную, эмацыянальную і іншыя) і апірацца пры чытанні лекцый, правядзенні семінарскіх і практычных заняткаў, на заліках на тыя віды памяці, якія найбольш развіты ў студэнтаў дадзенага ўзросту, групы, факультэта. Пры распрацоўцы методык мы ўжывалі тэставыя методыкі, якія ўжо вядомы (выключэнне лішняга паняцця, тэсты Айзенка па вызначэнню агульных здольнасцей і інш.). Але нашы методыкі пабудаваны на аснове курса «Сацыяльная псіхалогія», гэта значыць, што ужываецца абавязковы праграмны матэрыял па гэтай дысцыпліне.

Рагачова Л.М.,
ст.выкладчык

## РАЗВІЦЦЁ ТВОРЧЫХ ЗДОЛЬНАСЦЕЙ СТУДЭНТАЎ У ПРАЦЭСЕ ВЫВУЧЭННЯ НАРОДНАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ СПАДЧЫНЫ

Шматлікія даследаванні айчынных і замежных псіхолагаў і педагогаў сведчаць аб тым, что толькі творчая асоба ў стане актыўна і мэтанакіравана ўздзейнічаць на навакольны свет і пераўтвараць яго. Сёння стан нашага грамадства, глыбокія крызісныя з'явы ў яго развіцці, адсутнасць дакладнай праграмы і перспектывы выхаду краіны з крызісу сведчаць аб хранічным дэфіцыце творчых кадраў.

Агульнавядома, што ў кожным чалавеку закладзены тыя ці іншыя творчыя здольнасці. Але іх рэалізацыя ў многім залежыць ад таго, як будзе весціся падрыхтоўка моладзі да жыцця, якія формы і метады выхавання стануць вызначальнымі ў працэсе навучання ў школе і вышэйшай навучальнай установе.

Неабходна прызнаць той факт, что існуючая сістэма навучання ў ВНУ арыентавана на перадачу студэнтам як мага большага аб'ёму ведаў, вядомых ісцін. Імкненне ВНУ асучасніць праграмы навучання за кошт новых дысцыплін, безумоўна, дае станоўчы эфект у пашырэнні кругагляду маладых спецыялістаў. Але першыя ж крокі іх прафесійнай дзейнасці высвятляюць



БІБЛІЯТЭКА
Беларускага універсітэта культуры
Інв. № 299572

праблему больш шырокага маштабу: выпускнікі не могуць прымяніць на практыцы тую суму ведаў, якую яны атрымалі за гады вучобы. Аб'ем гэтых ведаў не дазваляе ўбачыць праблему ў яе генезісе, развіцці і шматбаковых узаемасувязях з навакольным асяроддзем. Толькі людзі творчыя знаходзяць вырашэнне гэтай праблемы. Адсюль вынікае, што перад педагагічным калектывам універсітэта стаіць задача больш мэтанакіраванага выхавання актыўнага суб'екта творчай сацыякультурнай дзейнасці. І перш за ўсе неабходна зыходзіць з уяўлення, што творчасць - гэта самадзейнасць і самастойнасць, уменне рацыянальна арганізаваць сваю работу, крытычна ацаніць раней зробленае, здольнасць вырашыць нефармальна звычайныя задачы.

Багаты матэрыял у гэтым плане дае вывучэнне беларускай народнай педагагічнай спадчыны. Аналіз выхаваўчага патэнцыялу народных традыцый дазваляе актывізаваць пазнавальную дзейнасць студэнтаў, развіць патрэбнасць у пашырэнні сваіх ведаў аб культурным набытку народа. Важным момантам у фарміраванні творчага багажу будучых культуролагаў з'яўляецца выкарыстанне такіх прыемаў навучання, як параўнанне мэт, формаў і метадаў выхавання, ужываемых у народнай педагогіцы, з рэкамендацыямі сучаснай педагагічнай навукі. Пры гэтым студэнт мае магчымасць вызначыць тыя элементы этнапедагогікі, якія ўвайшлі ў сучасную педагагічную навуку і практыку, а таксама адзначыць, што, на яго погляд, аказалася яшчэ не запатрабаваным, што неабходна адрадзіць.

Трэба адзначыць, што прыем дазваляе стварыць і падтрымліваць у аўдыторыі камфортныя зносіны са студэнтамі, стымулюе іх пазнавальную актыўнасць, стварае атмасферу станоўчых эмоцый і творчасці.

На развіццё творчага мыслення накіравана і сістэма заданняў для самастойнай працы студэнтаў, якая прадугледжвае вывучэнне і апісанне выхаваўчых традыцый у розных рэгіёнах Беларусі. Накіроўваючы увагу аўдыторыі на спецыфіку этнапедагогікі, выкладчык падводзіць студэнтаў да вызначэння вядучых нацыянальных рыс беларускага народа, параўнання іх з агульначалавечымі выхаваўчымі каштоўнасцямі. Знамянальна, што адказы на прапанаваныя ў такой пастаноўцы пытанні нельга знайсці ў падручніках, яны патрабуюць самастойнага супастаўлення даных многіх дысцыплін, параўнання мэт і зместу выхаваўчага працэсу на розных этапах гістарычнага развіцця як рэспублікі, так і сусветнага супольніцтва. Відавочна, што ў такім выпадку адсутнічае глеба для дагматычнага мыслення, але вельмі пашыраецца прастора для дыялектычнага, гібкага творчага мыслення.

Як сведчыць практыка, ужыванне падобных метадаў навучання, перанос акцэнту на самастойны пошук студэнтамі адказаў на актуальныя пытанні дазваляюць вырашаць праблемы пераадолення разрыву паміж тэарэтычнымі ведамі і прафесійнай дзейнасцю будучых спецыялістаў.

Бяспалая М.А.,
дацэнт

## ВЫВУЧЭННЕ ПЫТАННЯ АБ КРЭЎСКАЙ УНІІ Ў КУРСАХ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ І СУСВЕТНАЙ ГІСТОРЫІ

У курсах як нацыянальнай, так і сусветнай гісторыі вывучаецца пытанне аб Крэўскай уніі, заключанай паміж Вялікім княствам Літоўскім і Польскім каралеўствам у 1385 г. На першы погляд тут усе ясна, у студэнтаў не ўзнікае асаблівых цяжкасцей пры вывучэнні гэтай тэмы. Але гэта на першы погляд. Адны гісторыкі, напрыклад У.Ігнатоўскі, В.Ластоўскі, канцэнтруюць увагу на аналізе вынікаў уніі для княства, на пытанні захавання палітычнай самастойнасці. Другія, напрыклад В.Насевіч, канстатуюць факт уніі, разглядаюць яе падрыхтоўку і змест. Але такі падыход да гэтага пытання ўяўляецца аднабаковым. Яно патрабуе аналізу пазіцый усіх зацікаўленых бакоў. Калі на лекцыі можна абмежавацца канстатацыяй фактаў, то семінарскія заняткі даюць магчымасць калектыўнага пошуку гістарычна правільных высноў. Праўда, адной з галоўных складанасцей у вывучэнні тэмы з'яўляецца адсутнасць дакладнага тэксту Крэўскай уніі.

Абавязкова трэба адзначыць, што ў польскіх гісторыкаў свой погляд на унію. У «Гісторыі Літвы» І.Ахманьскага прама гаворыцца, што пад напорам крыжакоў Вялікае княства Літоўскае пасля смерці князя Альгерда стала слабець, а ў час канфлікту паміж Ягайлам і Кейстутам перажывала вырачны крызіс, менавіта таму яно было зацікаўлена ў саюзе з Польшчаю. Але ў аслабленні Вялікага княства Літоўскага можна сумнявацца, бо напярэдадні заключэння уніі Ягайла з дапамогаю Вітаўта захапіў тры крыжацкія замкі, нанес ордэну вялікія людскія страты.

Цяпер паглядзім на факт Крэўскай уніі з пункту гледжання еўрапейскіх гісторыкаў. У XIY ст. знешнепалітычнае становішча Польшчы было даволі складаным, таму што з поўначы актыўны націск на яе пачалі аказваць крыжакі. На захадзе працягвалася нямецкая каланізацыя. Адзін з самых вядомых гісторыкаў сучаснасці А.Дж.Тойнбі ў сваёй вядомай працы «Постижение истории» выказаў адназначны погляд на збліжэнне Польшчы з Вялікім княствам Лі-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ